**Ю. А. Паўлючэнка**

# ФАРМІРАВАННЕ І РАЗВІЦЦЁ ПАЗНАВАЛЬНАЙ АКТЫЎНАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ СРОДКАМІ ЗАЙМАЛЬНАСЦІ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Эфектыўнасць навучання, у тым ліку і беларускай мове, як адзначаюць вучоныя, знаходзіцца ў прамой залежнасці ад узроўню актыўнасці вучня ў гэтым працэсе. Пазнавальная актыўнасць разглядаецца імі як «якасць дзейнасці вучня, якая (якасць) праяўляецца ў яго адносінах да зместу і працэсу навучання, у імкненні да эфектыўнага авалодання ведамі і спосабамі дзейнасці за аптымальны час, у мабілізацыі маральна-валявога напружання на дасягненне навучальна-пазнавальнай мэты» [6, 5].

Паняцце «актыўнасць» блізкае да паняцця «дзейнасць», аднак дзейнасць з’яўляецца вышэйшай, уласцівай толькі чалавеку формай актыўнасці. Актыўнасць асобы, у тым ліку і вучня, знаходзіць сваё выяўленне ў шматлікай і шматграннай дзейнасці. Таму паняцці «пазнавальная актыўнасць» і «пазнавальная дзейнасць» разглядаюцца дыдактамі як вельмі блізкія [2, 3].

Пазнавальная актыўнасць школьнікаў уяўляецца складаным структурным утварэннем, аснову якога, паводле Т. П. Міхневіч, складаюць

МГПУ им. И.П.Шамякина

ўзаемазвязаныя і ўзаемазалежныя кампаненты: змястоўны, працэсуальны, матывацыйны, эмацыянальны [2].

Практыка паказвае, што ў працэсе актывізацыі вылучаецца некалькі ўзроўняў развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў: рэпрадуктыўны, прадуктыўны і творчы. Пры рэпрадуктыўнай актыўнасці вучань не цікавіцца вучэбным матэрыялам, вучэбныя заданні выконвае па ўзоры або з дапамогай сяброў ці настаўніка, не валодае навыкамі кантролю і самакантролю. Пры прадуктыўнай актыўнасці ён праяўляе эпізадычную цікавасць да вучэбнага прадмета, умее выконваць нескладаныя заданні, здольны да параўнання і абагульнення матэрыялу, выдзялення асноўных ідэй і паняццяў, набывае часткова развітыя навыкі кантролю (напрыклад, здольны ацаніць і пракаменціраваць адказ сябра). На найбольш высокім ўзроўні актыўнасці – творчым – вучань цікавіцца прадметам не толькі на ўроку, але і ў пазаўрочны час, праяўляе ўпартасць і настойлівасць у авалоданні ведамі, валодае не толькі кантролем, але і самакантролем, можа ажыццяўляць перанос ведаў у новую невядомую сітуацыю [2].

Фарміраванне і развіццё пазнавальнай актыўнасці малодшых школьнікаў у працэсе навучання беларускай мове з'яўляецца адной з самых складаных праблем сучаснай школы: падае цікавасць вучняў да засваення мовы, у выніку парушаецца правільнасць, дакладнасць і лагічнасць маўлення, зніжаецца пісьменнасць. Таму вырашэнне гэтай праблемы – неадкладная задача сучаснай дыдактыкі.

Працэс фарміравання і развіцця ў малодшых школьнікаў пазнавальнай актыўнасці дастаткова складаны і доўгі. Яго эфектыўнасць у многім залежыць ад ведання структуры пазнавальнай актыўнасці, паколькі гэта дазваляе кіраваць працэсам актывізацыі, вызначаць яго найбольш аптымальныя педагагічныя ўмовы.

Да сродкаў актывізацыі навучання школьнікаў дыдакты адносяць «навучальны змест, метады і прыёмы навучання, формы арганізацыі навучання» [6, 74].

Змест навучальнага матэрыялу садзейнічае абагачэнню і пашырэнню ведаў вучняў, набыццю імі вопыту, развіццю кругагляду. Аднак не ўсё ў змесце навучання прыцягвае школьнікаў. Таму перад настаўнікам паўстае задача – зацікавіць дзяцей.

Адным са сродкаў фарміравання і развіцця пазнавальнага інтарэсу з'яўляецца займальны матэрыял. У "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» слова *займальнасць* падаецца са значэннем 'уласцівасць займальнага', а *займальны* – 'які выклікае цікавасць; забаўны' [3, 317]. Вядомы псіхолаг Г. І. Шчукіна сцвярджае: «Калі нечаканыя займальныя прыёмы ствараюць сітуацыю, якая ўражвае вучняў, прымушае імгненна зразумець сутнасць ведаў, трывала замацаваць у эмацыянальнай памяці



МГПУ им. И.П.Шамякина

дадзены факт, дадзеную падзею, займальнасць служыць абагачэнню сапраўднага ўстойлівага інтарэсу" [7, 25].

Аб вялікай ролі займальнасці ў навучальным працэсе гаварыў К. Д. Ушынскі. Ён падзяляў яе на знешнюю і ўнутраную. "Самы незаймальны ўрок, – пісаў ён, – можна зрабіць для дзяцей займальным знешнімі сродкамі, якія не адносяцца да зместу ўрока... Унутраная займальнасць выкладання заснавана на тым законе, што мы ўважлівыя да ўсяго таго, што 1) з'яўляецца новым для нас, але не настолькі новым, каб быць зусім незнаёмым; новае павінна дапаўняць, развіваць або супярэчыць старому, словам, быць цікавым, дзякуючы чаму яно можа ўвайсці ў любую асацыяцыю з тым, што ўжо вядома; 2) абуджаць і даваць задавальненне абуджанаму ўнутранаму пачуццю. Чым старэйшы становіцца вучань, тым больш унутраная займальнасць павінна выцясняць сабой знешнюю" [5, 405–406].

Выкарыстанне займальнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы ўносіць разнастайнасць у навучальную дзейнасць, садзейнічае засваенню ведаў не па неабходнасці, а па жаданні саміх вучняў, павышае пазнавальны інтарэс да прадмета, дае магчымасць вучням ацаніць сябе на фоне іншых. Захапіўшыся, дзеці не заўважаюць, што вучацца: яны лёгка спазнаюць, запамінаюць новае, арыентуюцца ў незвычайных сітуацыях, папаўняюць запас уяўленняў, паняццяў, развіваюць фантазію.

Яркая, эмацыянальная форма вучэбнага матэрыялу дапамагае настаўніку актывізаваць працэс навучання. Механізм гэтай з'явы заключаецца ў тым, што "займальнасць абуджае цікаўнасць, цікаўнасць пераходзіць у дапытлівасць і абуджае інтарэс да прадмета, што ў сваю чаргу нараджае патрэбнасць у глыбокім авалоданні ведамі і вядзе да раскрыцця і развіцця патэнцыяльных задаткаў і здольнасцей" [1, 12].

Калі пры знаёмстве з новай тэмай на ўроку выкарыстоўваецца прынцып займальнасці і разнастайныя гульнёвыя моманты, якія выклікаюць у вучняў станоўчую матывацыю да вывучэння роднай мовы, то нават цяжкі матэрыял засвойваецца лягчэй. Апорныя схемы, табліцы, праблемныя пытанні, займальныя гісторыі, казкі, загадкі, рыфмаванкі, жарты станоўча ўплываюць на адносіны вучняў да роднай мовы як да навучальнага прадмета, спрыяюць развіццю ў іх назіральнасці, фантазіі, зрокавай памяці.

Навуковасць і глыбіня тэарэтычнага матэрыялу, што выкладаецца на ўроках, паказ яго практычнай значнасці не могуць быць адарваныя ад займальнай формы падачы гэтага матэрыялу, эмацыянальнасці і жывасці выкладання. Займальнасць, выступаючы першапачатковым штуршком у праяўленні пазнавальнай цікавасці, з'яўляецца сродкам стварэння станоўчага фону ўсяго ўрока, апорай для развіцця прафесійнай памяці.

Трэба мець на ўвазе, што займальнасць выкладання заключаецца не толькі ў пацешных і жартаўлівых прыёмах гульнёвай працы, але

МГПУ им. И.П.Шамякина

і ў напаўненні зместу выкладання навуковым і ў той жа час цікавым для вучняў моўным матэрыялам. Толькі разумнае спалучэнне формы і зместу выклікае ў вучняў глыбокую цікавасць да вывучэння роднай мовы, да фактаў і заканамернасцей яе развіцця. «Аднак не ўсякая займальнасць, – падкрэслівае А. В. Солахаў, – накіравана на выхаванне сапраўднага інтарэсу да вывучэння прадмета. Калі займальнасць выступае на ўроку як самамэта, калі яна не звязана з пазнавальным, навуковым зместам урока, яна ніколі не пасее ў душы школьніка ўсходаў сапраўднага пазнавальнага інтарэсу. Выкарыстанне займальнага матэрыялу апраўдваецца толькі тады, калі ён цесна звязаны з тэмай урока і накіраваны на яе больш глыбокае раскрыццё, дапамагае знайсці рашэнне навуковай праблемы, садзейнічае творчай актыўнасці вучняў» [4, 115].

Асноўнымі шляхамі выкарыстання займальнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы з’яўляюцца:

1) арыгінальная структура ўрока;

2) выкарыстанне спецыяльна распрацаваных займальных заданняў і дыдактычных гульняў;

3) самастойнае выкананне вучнямі творчых заданняў з далейшым іх выкарыстаннем у працы з іншымі вучнямі.

Займальнасць адносіцца не столькі да псіхічнага стану чалавека, колькі да якасці рэчаў, прадметаў, з’яў, якія ўздзейнічаюць на інтарэс. Уласцівасці гэтыя выяўляюцца ў навізне, нечаканасці, дзівацтве, неадпаведнасці з тым, як матэрыял падаваўся раней.

Займальнымі з’яўляюцца дзелавыя і арганізацыйна-дзейнасныя гульні, праблемныя сітуацыі, пытанні-жарты, конкурсы, фізкультмінуткі, звязаныя з тэмай урока, моўна-рухомыя спаборніцтвы, рыфмаванкі, лінгвістычныя казкі, загадкі, шарады, кур’ёзы і г. д.

Так, напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Прыметнік як часціна мовы” можна выкарыстаць практыкаванні займальнага характару “**Пабудзем следчымі**”, “Адгадай прадмет па прыметах”, “Ручаёк”, “Прадоўжы рад”, “Пятае – лішняе”, “Хто больш?”, лінгвістычную эстафету і інш.

**Пабудзем следчымі**

Што ў сваім вершы ахарактарызаваў Пімен Панчанка, выкарыстаўшы амаль адны прыметнікі.

*Ільняная і жытнёвая, сялянская,*
*Баравая ў казачнай красе,*
*Старажытнейшая,*
*Самая славянская,*
*Светлая, як травы ў расе,*
*Вобразная, вольная, пявучая*
*… беларуская мая.*

(Мова.)

**Адгадай прадмет па прыметах**

Адзін з вучняў выходзіць з класа. Астатнія ў гэты час прыдумваюць які-небудзь прадмет (напрыклад, *яблык*). Вучань, які павінен адгадаць слова, вяртаецца ў клас і падыходзіць па чарзе да сваіх аднакласнікаў.



МГПУ им. И.П. Шамякина

Кожны з іх павінен назваць прыметнік, які указвае на якую-небудзь прымету задуманага слова (*круглы, чырвоны, салодкі, сакавіты* і інш.).

**Ручаёк**

Настаўнік прапануе вучням назоўнік, да якога патрэбна падабраць прыметнікі. Вучні, перадаючы мяч адзін аднаму, называюць прыметнік, які б характарызаваў гэты назоўнік. Хто паўторыцца або затрымаецца з адказам, выходзіць з гульні.

***Словы для гульні:*** *Радзіма, дарога, поле.*

**Прадоўжы рад**

Прадоўжы рад прыметнікаў (на выбар), якія даюць характарыстыку чалавеку, жывёле або прадмету. У каго гэты рад атрымаецца даўжэйшы, той і пераможа.

*Дзяўчынка – добразычлівая, ... .*

*Вучань – старанны, ... .*

*Надвор'е – цёплае, ... .*

*Кніга – цікавая, ... .*

*Мядзведзь – вялікі, ... .*

**Пятае – лішняе**

Што нельга сказаць пра прадмет адначасова?

*Груша – спелая, сакавітая, жоўтая, зялёная, духмяная.*

*Дзень – сонечны, цёплы, ціхі, летні, халодны.*

*Галінка – зялёная, доўгая, тоўстая, тонкая, маладая.*

**Які ты чалавек?**

Складзі праўдзівы ланцужок прыметнікаў, якія б характарызавалі цябе. У каго ланцужок атрымаецца даўжэйшы, той і перамагае.

*Я – ...*

**Хто больш?**

Мама ў нас якая? (*Прыгожая, непаўторная, добрая, маладая, клапатлівая, вясёлая, любімая, найлепшая* і г. д.).

Прырода вакол нас якая? (*Непаўторная, прыгожая, экзатычная, цудоўная, цікавая, маляўнічая, жывая* і г. д.).

Надвор'е можа быць якім? (*Сонечным, дажджлівым, цёплым, ветраным, халодным, жудасным, непрыемным, марозным* і г. д.).

Сябар твой які? (*Клапатлівы, добры, добразычлівы, разумны, прыгожы, ветлівы, кемлівы, найлепшы, сумны* і г. д.).

**Лінгвістычная эстафета**

Вучні адной каманды падбіраюць прыметнікі да назоўніка *снег*, другой – да назоўніка *кветка*, трэцяй – да назоўніка *сонца*. Па адным яны бягуць з лініі старта да дошкі і запісваюць патрэбнае слова. Эстафетнай палачкай служыць кавалачак крэйды.

МГПУ им. И.П.Шамякина

**Конкурс матэматыкаў**

Настаўнік чытае ўголас тэкст, а вучні выпісваюць у сшытак прыметнікі ў пачатковай форме і падлічваюць іх (тое самае слова 2 разы не выпісваць).

*Моцна скаваў мароз **голую** зямлю, зрабіў яе **цвёрдай**. Вымерзлі лужыны, высахла гразь. **Халодная ледзяная** кара пакрыла рэкі і азёры. **Цвёрдую** пасцель падрыхтаваў мароз для **белага** снегу. Вось падзьмуў сівер. Папаўзлі па небе **снегавыя** хмары. Яны завалаклі ўсё неба.*

Паводле Якуба Коласа.

Адказ: *голы, цвёрды, халодны, ледзяны, белы, снегавы* – 6 прыметнікаў.

**Рэдактар**

Замяніце словазлучэнні "назоўнік + назоўнік" словазлучэннямі "прыметнік + назоўнік".

*Талерка з гліны, завушніцы з золата, школа ў горадзе, дзень летам, дапаможнік для вучэння, стол бацькі, пісьмо брата, творы Коласа, бярлога мядзведзя, падручнік Дзімы.*

Адказ: *гліняная талерка, залатыя завушніцы, гарадская школа, летні дзень, вучэбны дапаможнік, бацькаў стол, братава пісьмо, Коласавы творы, мядзведжая бярлога, Дзімаў падручнік.*

**Конкурс майстроў слова**

Замест шматкроп'я ў вершы ўстаўце прапанаваныя прыметнікі. Хто зробіць гэта правільна і хутчэй, той і пераможа.

***Восень залатая***

*Восень, восень …*
*Сее радасць на зямлі.*

*Хмарка ў … небе тае.*
*Мкнуць у вырай жураўлі.*

*Не чуваць у лесе птушак,*
*… гоман сціх і шум.*
*Матылькоў няма і мушак –*
*Луг ахутаў … сум.*

*Ніткай … павуцінне*
*Ў косах сонейка блішчыць.*

*Што за … зіхценне!*
*Што за ціш вакол стаіць!*

*Я іду … сцежкай,*
*Як па … дыване.*
*Восень з … усмешкай*
*На спатканне выйшла мне.*

*Ярка, хораша прыбрала*
*Ўсюды дрэвы і кусты*
*І зямлю памалявала*
*Ў колер … .* С. Новік-Пяюн

***Словы для даведак:*** *срэбнай, цуднае, лясною, мяккім, ветлівай, жоўта-залаты, мілы, летні, сінім, залатая.*

МГПУ им. И.П.Шамякина

**Конкурс перакладчыкаў**

Хто правільна і хутчэй за іншых перакладзе словазлучэнні “прыметнік + назоўнік” з рускай мовы на беларускую, той і пераможа.

1. *Металлическая пуговица. (Металічны гузік.)*
2. *Нестерпимая боль. (Нясцерпны боль.)*
3. *Мягкий ковёр. (Мяккі дыван.)*
4. *Художественное произведение. (Мастацкі твор.)*
5. *Красивые обои. (Прыгожыя шпалеры.)*
6. *Беличьи запасы. (Вавёрчыны запасы.)*
7. *Деревянный ящик. (Драўляная скрыня.)*
8. *Умный ребёнок. (Разумнае дзіця.)*
9. *Буслиное гнездо. (Буслава гняздо.)*
10. *Серебряные изделия. (Срэбныя вырабы.)*
11. *Интересная книга. (Цікавая кніга.)*
12. *Городской парк. (Гарадскі парк.)*
13. *Волчий след. (Воўчы след.)*
14. *Вкусный ужин. (Смачная вячэра.)*

Займальны матэрыял стварае станоўчы эмацыянальны фон дзейнасці, развівае творчыя здольнасці вучняў, выклікае ў іх жаданне выканаць тыя заданні, якія лічацца цяжкімі.

Методыка працы з займальным матэрыялам разнастайная. Ён выкарыстоўваецца на розных этапах урока: пры тлумачэнні новага матэрыялу і яго замацаванні, пры праверцы хатніх заданняў, паўтарэнні, у пазакласнай рабоце. Багаты і разнастайны займальны матэрыял накіраваны на развіццё маўленчых здольнасцей вучняў, на актывізацыю іх мыслення, на асэнсаванне багацця беларускай мовы, яе выразнасці і дакладнасці, пявучасці і дасканаласці.

Такім чынам, каб сфарміраваць пазнавальную актыўнасць малодшых школьнікаў да вывучэння беларускай мовы, захаваць і развіваць іх пазнавальны інтарэс да яе, настаўнік пры арганізацыі працэсу навучання павінен улічваць структурныя кампаненты, узроўні і сродкі павышэння пазнавальнай актыўнасці. Выкарыстанне займальнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы спрыяе фарміраванню і развіццю пазнавальнай актыўнасці вучняў, садзейнічае глыбокаму разуменню і павышэнню якасці засваення новага матэрыялу. Ужыванне розных прыёмаў правядзення ўрока, выкарыстанне гульняў і іх элементаў, конкурсаў, спаборніцтваў робіць навучальны працэс цікавейшым, дзеці стабільна выяўляюць актыўнасць, кемлівасць і дабіваюцца высокіх вынікаў.

МГПУ им. И.П.Шамякина

**Літаратура**

1. Бондаревский, В.Б. Воспитание интереса к знаниям и потребности к самообразованию: кн. для учителя / В.Б. Бондаревский. – М.: Просвещение, 1985. – 144 с.

2. Міхневіч, Т.П. Фарміраванне пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў: метадычны дапаможнік / Т.П. Міхневіч. – Мінск: Беларус. дзярж. універсітэт, 1993. – 12 с.

3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. – Мінск: Гал. рэд. БелСЭ, 1978. – Т. 2: Г–К / рэд. тома А.Я. Баханькоў. – 768 с.

4. Солахаў, А.В. Займальнасць на ўроках беларускай мовы / А. В. Солахаў // Весці Гомельскага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны. – 2000. – № 2 (25): Беларуская мова. – С. 115–120.

5. Ушинский, К.Д. Педагогические сочинения: в 6 т. – М.: Педагогика, 1990. – Т. 6 / сост. С. Ф. Егоров. – 528 с.

6. Шамова, Т.И. Активизация учения школьников / Т.И. Шамова. – М.: Педагогика, 1982. – 209 с.

7. Щукина, Г.И. Педагогические проблемы формирования познавательных интересов учащихся / Г.И. Щукина. – М.: Педагогика, 1988. – 208 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина